

Газета заснавана ў 1938 годзе. Аднаўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№7 (349) 12 — 18 лютага 2004 г. Наклад 11.100 экз. Кошт у розніцу свабодны

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ
Слонім,
Зэльва,
Дзятлава,
Масты,
Ваўкавыск,
Шчучын,
Ліда,
Гродна,
Баранавічы,
іншыя гарады Беларусі,
а таксама на HTTP://gs.promedia.by

ПРАБЛЕМА

СПАКОЙНА!

або У СЛОНІМСКІМ РАЁНЕ НЯМА ШКОЛ, ПАБУДАВАНЫХ ПА МАГІЛЁЎСКІМ ПРАЕКЦЕ

Бяспека дзяцей у школе і пазашкольных установах стала асабліва актуальнай пасля трагедыі ў вясковай школе ў Краснаполлі, дзе ў выніку абвалу даху спартзала загінулі чатыры чалавекі, трое з якіх былі школьнікамі. На жаль, такія факты ў межах нашай краіны нярэдкія.

Днямі карэспандэнты "ГС" завіталі ў сярэднюю школу №2, у якой яшчэ напрыканцы верасня 2003 года пачалі рамантаваць дах. Падставай для візіту сталі скаргі бацькоў, якія хвалююцца за жыцці сваіх дзяцей.

Справа ў тым, што трэці паверх аднаго з карпусоў школы літаральна залівае вадой падчас дажджу і раставання снегу. Дах пабудаванай у 1978 годзе школы сканструяваны такім чынам, што вада там стаіць тыднямі. Як кажуць настаўнікі-старажылы, не было года, каб школу не залівала. Сама вада, вядома ж, небяспекі для жыцця не ўяўляе, але яна трапляе да месцазнаходжання электраправодкі. Гэта азначае, што вучні могуць проста шчоўкнуць выключальнікам, — і тое, што можа здарыцца далей, уявіць сабе няцяжка...

Як і няцяжка знайсці месцы ў школе, дзе вада размывае тынкоўку. Напрыклад, калі заглянуць у спартыўную залу, бачна, што вада амаль агаліла стыкі паміж перакрыццямі і на іх месцы з'явіліся глыбокія дзіры.

Працяг на 2 стар.



Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

■ Урок матэматыкі праходзіць у СШ №2 пад капеж вады са столі

••• ИНФОРМАЦИЯ •••

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ ПО СОСТОЯНИЮ НА 10.02.2004 ГОДА

"Беларусбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	2130	2170
1 EURO	2700	2800
1 ZL	545	585
1 RUR	74	77,00
"Белпромстройбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	2140	2168
1 EURO	2710	2780
1 ZL	535	585
1 RUR	74	76,4
"Белагропромбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	2130	2165
1 EURO	2680	2780
1 ZL	530	590
1 LAT	3900	4100
1 LIT	700	800
1 UAH	360	410
1 GBP	3850	4020
1 RUR	74	76

••• РЕКЛАМА •••

ЗАКОН ЁСЦЬ ЗАКОН

СЛУЖБОВАЯ МАШЫНА: КУДЫ ХАЧУ, ТУДЫ І ЕДУ?

■ Сяргей ЧЫГРЫН

Кожны з кіроўцаў сёння ведае вядомую песеньку, у якой ёсць такія словы: "Крепче за баранку держись шофер..."


Фота з архіва "ГС"

■ На такіх легкавіках любяць ездзіць чыноўнікі

Успомніўшы гэтыя словы, прыходзіш да высновы, што мацней за ўсіх сёння за руль аўтамашын, асабліва службовых, трымаюцца чыноўнікі і адказныя асобы прадпрыемстваў і арганізацый. І так моцна трымаюцца, што гойсаюць на службовых аўто і ў будзень, і ў выходныя дні, і ў святы. Можна падумаць, што яны свету белага, як кажуць, не бачаць ад работы. Але гэта зусім не так.

Пацвярджэннем можа служыць і закон Савета Міністраў Беларусі ад 7 чэрвеня 2001 года "Аб упарадкаванні выкарыстання службовых і спецыяльных легкавых аўтамабіляў", дзе кіраўнікам дзяржаўных структур забаронена ў выхадныя дні карыстацца сваімі службовымі аўтамабілямі. Выключэнне зрабілі толькі для міліцыі, "хуткай дапамогі" і адказных асоб прадпрыемстваў з бесперапыннай вытворчасцю. Акрамя таго, беларускія прадпрыемствы павінны былі абгрунтаваць неабходнасць кожнага службовага аўтамабіля. А кантраляваць выкананне новага закону павінны беларускія праваахоўныя органы.

Дарэчы, абмежаванні на выкарыстанне легкавога аўтатранспарту маюць у Беларусі ўжо пяцігадовую гісторыю. Пастановай Саўміна ад 3 траўня 1999 года дазволілі адносіць на сабекошт толькі адзін службовы легкавы аўтамабіль. Патрабаванне датычыла як уласных машын, так і тых, што браліся ў арэнду, ці транспарту супрацоўнікаў, які выкарыстоўваўся ў службовых мэтах. Тады ўсе суб'екты гаспадарання кінуліся рэгістраваць свае легкавікі як "спецыяльны" аўтатранспарт. Іх фантазію трохі супакоіла вышэйназваная пастанова ад 7 чэрвеня, дзе дапускалася адносіць на сабекошт затраты выкарыстання спецыяльных легкавых аўтамабіляў толькі ў межах ліміту па зарплаце, падатках, энергарэсурсах і крэдытах, атрыманых пад гарантыю ўрада. Пасля гэтыя патрабаванні пастановай ад 4 ліпеня 2003 года распаўсюдзілі і на легкавыя аўтамабілі аператыўнага прызначэння.

Каб не стрыгчы ўсіх пад адзін грэбень, цяпер да 1 сакавіка гэтага года неабходна зацвердзіць галіновыя нарматывы забеспячэння спецыяльнымі легкавымі аўтамабілямі арганізацый, што фінансуюцца і атрымліваюць датацыі з бюджэту, а таксама рэспубліканскіх і камунальных унітарных прадпрыемстваў, гаспадарчых таварыстваў, якія маюць ва ўстаўных фондах долю (акцыі), дзе 50% і больш належыць дзяржаве. Акрамя таго, сёлета да 1 траўня павінны зацвердзіць для бюджэтных арганізацый табелі належных спецыяльных, а таксама ліміты колькасці службовых легкавых машын, абмежаваны ліміт прабегу да 2 тыс.км у месяц. А дзяржпрадпрыемствам і арганізацыям з доляю дзяржуласнасці больш за 50% прыйдзецца ўзгадняць колькасць такога транспарту.

Кантроль за эксплуатацыяй і тэхнічным абслугоўваннем спецыяльных легкавых аўтамабіляў ускладзены на Міністэрства ўнутраных спраў.

Напрыклад, на сёння карэспандэнту "ГС" невядомыя факты, каб на Слонімшчыне пакаралі хоць аднаго чыноўніка ці адказную асобу за выкарыстанне транспарту ў выхадныя дні ці ў асабістых мэтах. І наогул гэта зрабіць будзе вельмі цяжка. Хаця мы добра ведаем, што некаторыя старшыні сельскагаспадарчых вытворчых кааператываў жывуць у горадзе, а на працу дабіраюцца на службовых машынах у рабочыя дні і ў выхадныя. Транспартам службовым карыстаюцца і іх жонкі, а таксама жонкі чыноўнікаў і службовых асоб. Ды і самыя чыноўнікі, і адказныя асобы любяць на службовым транспарце з'ездзіць на дачу ці пікнічок.

Дарэчы, такія маршруты трапляюць пад парушэнне вышэйназваных законаў і караюцца штрафамі: юрасобы — ад 50 да 500 базавых велічынь, а адказныя асобы — ад 30 да 50.

Прадстаўнікі суб'етаў недзяржаўнай формы ўласнасці могуць эксплуатаваць у святочныя і выхадныя дні транспартныя сродкі аператыўнага прызначэння, а таксама спецыяльныя легкавыя машыны, якія выкарыстоўваюцца арганізацыямі, што маюць безупынны цыкл работы ці зацверджаны графік работы. ■

ПРАБЛЕМА

СПАКОЙНА!

або У СЛОНІМСКІМ РАЁНЕ НЯМА ШКОЛ, ПАБУДАВАНЫХ ПА МАГІЛЁЎСКІМ ПРАЕКЦЕ

Працяг. Пачатак на 1 стар.

Настаўнік фізічнай культуры кажа, што толькі, на шчасце, тынкоўка яшчэ не пачала падаць на галовы вучняў.

І гэта да таго, што зараз у спартыўнай зале вымушаны займацца адначасова тры класы, таму што другая зала занятая вучнёўскімі сталамі: у ёй вучацца дзеці, бо пакуль забаранілі знаходзіцца вучням на трэцім паверсе, дзе ідзе рамонт.

Але ўсіх вучняў "рассяліць" па школе немагчыма, таму многія класы займаюцца пад кропельны звон. Адміністрацыя школы моліцца аб адным: каб вясна была больш-менш сухой і будаўнікі завяршылі рамонт даху своечасова, бо бяспека дзяцей у школе абвешчана дзяржаўнай палітыкай.

Толькі вось грошай на ўсе школы не хапае, таму, напрыклад, у сярэдняй школе №8, дзе дах таксама ў дрэнным стане амаль ад адкрыцця школы, бацькоў на ўсялякі выпадак у спартыўную залу не пускаюць. А заняткі фізічнай культурай па магчымасці праводзяць на двары.

Карэспандэнт "ГС" звязалася з кіраўніком упраўлення адукацыі Галінай Шмялёвай. Галіна Іванаўна запэўніла журналіста, што рамонт даху другой школы не звязаны з трагедыяй, яго запланавалі значна раней. Будаўнікі павінны зрабіць дах школы пакатым, каб вада не застойвалася на ім і не разбурала сцяну. Калі рамонт завяршыцца, не ведае ніхто: грошай у гарадскім бюджэце, як заўжды, не хапае. Таксама Галіна Шмялёва адзначыла, што ніякай паніке сярод бацькоў вучняў быць не павінна: у нашым раёне школ, пабудаваных па магілёўскім праекце, няма.

Яніна МЕЛЬНІКАВА

АРМИЯ

ВОТ ТАКОЕ МОЛОДОЕ ПОПОЛНЕНИЕ

Более месяца времени было у армейских психологов, чтобы проанализировать качественные характеристики молодого пополнения, пришедшего в 11-ую механизированную бригаду в начале 2004 года. И вот что получилось.

По словам заместителя командира бригады по морально-психологическому обеспечению полковника Виктора Матука, 90% молодых воинов (из 423-ех) пришли служить с желанием. Высшее образование имеют 18 солдат, незаконченное высшее — 10. Закончили техникумы 50 человек, среднеспециальное образование – у 182 молодых воинов и еще 193 имеют среднее образование.

До призыва на срочную военную службу 180 парней работали на госпредприятиях, 59 — в сельском хозяйстве, 68 — в других организациях и частных фирмах. По социальному положению молодое пополнение разделилось так: 223 — из рабочих, 112 — из крестьян, остальные — из служащих и других слоев населения.

132 парня (чуть больше 30%) пришли в армию из многодетных семей (три и более ребенка). Но при этом около 20% призванных этой зимой на службу ребят — из неполных семей и воспитывались лишь одним из родителей. Одиннадцать солдат отправились в армию уже женатыми, и у семи из них уже есть дети.

Как отметил полковник Виктор Матук, с каждым призывом в бригаду приходит все более грамотное молодое пополнение. И связано это, прежде всего, с переизбытком призывников и конкурсным отбором на военную службу.

Теперь же 300 из 423-ех молодых солдат готовятся к отправке в 72-й отдельный учебный центр (более известный как учебка Печи) для получения воинской специальности.

Валерий КОВАЛЕНКО

АФІЦЫЙНА

УЗНАГАРОДЗІЛІ ПАДЗЯЧНЫМ ЛІСТОМ

За добрасумленную працу ў сістэме аховы здароўя насельніцтва доктар агульнай практыкі Слонімскай гарадской паліклінікі Тамара Сцяпанаўна Грэк узнагароджана Падзячным лістом старшыні аблвыканкама.

З 17-і ўзнагароджаных Падзячным лістом працаўнікоў розных галін гаспадаркі Гродзенскай вобласці доктар Тамара Грэк з'яўляецца адзіным прадстаўніком Слонімшчыны. Большасць узнагароджаных (10 чалавек) працуе ў абласным цэнтры.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННЕ

ЛАБАВОЕ СУТЫКНЕННЕ: СЕМЯРЫХ ЧАЛАВЕК ШПІТАЛІЗАВАЛІ


Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

■ "Форд" і "фольксваген" пасля аварыі

У нядзелю, 8 лютага, на аўтатрасе Слонім—Баранавічы, недалёка ад Новай Стражы, у 18 гадзін здарылася аўтамабільная аварыя.

Жыхар Магілёва, які сядзеў за рулём аўтамабіля "Фольксваген-Пасат" і ехаў у бок Слоніма, вырашыў абагнаць аўтафургон. На вялікай хуткасці ён аб'ехаў фуру і выскачыў на паласу сустрэчнага руху, па якой у бок Баранавічаў ехаў "Форд-Мандэо", кіроўцам і пасажырамі якога былі слонімцы. Падчас такога манеўра "фольксвагена" і адбылося сутыкненне дзвюх легкавых машын. У выніку гэтага сем чалавек з цяжкімі траўмамі трапілі ў Слонімскую раённую бальніцу.

Сяргей ЧЫГРЫН

ВЁСКА ДАЕ СПРАВАЗДАЧУ

НАЗІРАЕЦЦА ТЭНДЭНЦЫЯ ДА ГОРШАГА

▪ Мікола КАНАНОВІЧ

У лютым пачаліся справаздачна-выбарчыя сходы ў сельскіх гаспадарках раёна. На такім сходзе сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва "Вострава-Агра" 7-га лютага быў карэспандэнт "ГС".

Акрамя праўлення і членаў кааператыва, на сходзе прысутнічалі старшыня Слонімскага райвыканкама Мечыслаў Касцюк, старшыня раённага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Аляксандр Хворык і старшыня Міжэвіцкага сельсавета Марыя Пясляк.

Як і належыць паводле рэгламенту, спачатку са справаздачай пра працу гаспадаркі за мінулы год выступіў старшыня праўлення кааператыва Васіль Серы. У сваім дакладзе ён сказаў, што гаспадарка цяпер знаходзіцца ў крызісным стане, як і многія сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Старшыня адзначыў, што цэны на прадукты сельскай гаспадаркі не пакрываюць затратаў на іх вытворчасць. Яны зусім нязначна павялічваюцца ў параўнанні з падаражаннем прамысловых тавараў, энерганосьбітаў і ГЗМ. Падатковую палітыку ў галіне сельгасвытворчасці старшыня назваў непад'ёмнай. Ён таксама зазначыў, што сённяшняя сістэма аплаты працы на вёсцы не садзейнічае зацікаўленасці работнікаў у яе выніках. А адсюль і адпаведныя адносіны людзей да сваіх працоўных абавязкаў: адукаваныя і вопытныя спецыялісты шукаюць больш высокааплачваемыя месцы працы, а ў асяродку радавых работнікаў квітнеюць п'янства, гультайства і абыякавасць.

Фактычная частка даклада старшыні кааператыва была малааптымістычнай. План вытворчасці сельгаспрадукцыі ў 2003 годзе гаспадарка не выканала як па раслінаводстве, так і ў жывёлагадоўлі. Сваю негатыўную ролю тут у многім сыграў і прыродны фактар. На ўраджайнасці адбіліся засухі апошніх гадоў. Восенню 2002 года насенне азімых збожжавых і збожжа-бабовых культур падрыхтавалі 1-га гатунку, адкак месяц яно не ўзыходзіла ў сухой глебе. Вясной 2003 года частыя паломкі тэхнікі, недахоп запчастак і паліва не далі магчымасці ў аптымальныя тэрміны закончыць сяўбу яравых збожжавых і збожжа-бабовых культур. Нізкая якасць ворыва і недахоп азотных угнаенняў таксама не садзейнічалі добраму ўраджаю. Да таго ж з траўня да верасня практычна не было дажджоў. Таму збожжавыя не выраслі. Найбольшая ўраджайнасць пшаніцы склала 28,5 ц/га, па іншых культурах — крыху большая за 20 ц/га. Не ўрадзілі таксама бульба і караняплоды, хаця з вясны пасевы абяцалі добры ўраджай.

У жывёлагадоўлі план па надоях малака выканалі на 99%, а па здачы мяса толькі на 68%. У гаспадарцы ёсць 1 620 галоў буйной рагатай жывёлы, з іх 500 галоў складае дойны статак. Найбольшыя надоі на ферме вёскі Вострава — 2 600 кг малака ад каровы ў год, а сярэднія надоі па гаспадарцы склалі за справаздачны перыяд 2 450 кг. Аднаўленне статка таксама пакідае хацець лепшага, бо на 100 кароў нараджаецца толькі 70 цялят.

Станоўчым у працы кааператыва за мінулы год старшыня назваў рамонт фермаў у вёсках Вострава і Старая Перавалока ды мадэрнізацыю на ферме ў Востраве даільнай устаноўкі.

Гаспадарка таксама дапамагла людзям у пасадцы і ўборцы бульбы, нарыхтоўцы кармоў для прыватнай жывёлы і разлічылася па заробках.

У канцы свайго выступлення Васіль Серы сказаў, што ў гэтым годзе ёсць спадзеў на добры ўраджай, бо больш, чым летась, і ў тэрмін пасеяна азімых. Яны знаходзяцца ў добрым стане. У тым ліку і азімы рапс. Цяпер у гаспадарцы асноўнае — гэта падрыхтоўка тэхнікі для веснавых работ. Хоць і не ў дастатковай колькасці, але ўжо закупілі неабходныя запчасткі.

Пасля даклада старшыні выступалі галоўныя спецыялісты і старшыня рэвізійнай камісіі.

Галоўны аграном Міхаіл Савік, у прыватнасці, скіроўваў увагу прысутных на недахоп неарганічных угнаенняў і прапанаваў вазіць з балота на палі торф у якасці арганікі, палепшыць на перыяд пасяўной працу дыспетчарскай службы і сувязі ды папрасіў забяспечыць палівам службовы транспарт, бо аграном без паліва, па яго словах, — гэта не аграном.

Галоўны заатэхнік, у сваю чаргу, указваў на адсутнасць паўнавартаснага харчавання для жывёлы. Ён сказаў, што жывёлагадоўля жыве па астаткавым прынцыпе. Па рацыёне бялкамі жывёла забяспечана толькі на 45—50%, не вырашаецца пытанне з камбікармамі. У мінулым годзе нарыхтавалі па 16 цэнтнераў кармоў на ўмоўную галаву. Хоць гэта крыху і больш, чым у папярэднім годзе, але таксама недастаткова на ўвесь перыяд зімоўкі. На зніжэнне паказчыкаў вытворчасці малака і мяса ўплываюць і дрэнныя ўмовы ўтрымання жывёлы. На фермах даўно знасілася абсталяванне ў сістэме выкачкі гною. На замену транспарцёраў і якасны рамонт сістэмы ў гаспадаркі не хапае сродкаў. "Гной некалькі чалавек адкачваюць цэлы дзень, а толку няма," — скардзіўся заатэхнік.



▪ На льняным полі колішняга калгаса "Рассвет", восень 2002 г.

Галоўны эканаміст і галоўны бухгалтар аперавалі ў сваіх выступленнях лічбамі. Лічбаў было многа, але асноўныя з іх — гэта 46 мільёнаў рублёў убыткаў па выніках працы за справаздачны перыяд, альбо мінус 6,6% рэнтабельнасці, ды да гэтага плюс 190 мільёнаў ранейшых даўгоў розным крэдыторам.

З гасцей слова папрасіў старшыня райвыканкама Мечыслаў Касцюк. У сваім выступленні ён сказаў, што апошнія гады ў гаспадарцы назіраецца тэндэнцыя да горшага.

"Але хіба пагода вінаватая, што несвоечасова альбо дрэнна заралі, не адрамантавалі льнокамбайна?.. З 78-і членаў кааператыва ў зале я налічыў толькі 48. Гэта такія ў вас адносіны да справы. Дзяржава не можа ўзяць усю ношу вашых клопатаў на сябе. На 121,9 мільёна рублёў дапамагла вам дзяржава ў мінулым годзе. Я не кажу, што гэта многа. Але дзяржава дапамагае ў першую чаргу тым, хто добра працуе, а не закопвае грошы ў пясок. Дзяржава датуе кожную тону малака і мяса, здадзеную на мясакамбінат і малаказавод. А ніжэйшых за вас па жывёлагадоўлі ўжо нікога няма. Вам трэба акунацца ў працу з усёй сур'ёзнасцю і ўсім разам. Бяда ўжо на парозе, яна стукаецца ў ваш дом..." — зазначыў старшыня райвыканкама і пажадаў поспехаў у 2004 годзе.

Рэвізійная камісія працу праўлення СВК "Вострава- Агра" прызнала здавальняючай, і сход прагаласаваў за працяг паўнамоцтваў праўлення да 2006 года.

А калі старшыня прафкамітэта Мікалай Лаўрутыч, які вёў сход, прапанаваў прагаласаваць за новую калектыўную дамову, у зале ўзнікла замяшанне. Тады свайго калегу падтрымаў раённы прафсаюзны лідэр Аляксандр Хворык. Ён стаў тлумачыць прысутным, што паводле новага працоўнага заканадаўства калектыўная дамова заключаецца толькі з членамі прафсаюза, а не з усімі работнікамі кааператыва, і заклікаў людзей напісаць заявы на ўступленне ў прафсаюз. На той момант з 78-і членаў кааператыва ў прафсаюзе лічыліся толькі 50. Аднак прысутныя выказваліся супраць уступлення, матывуючы адказ тым, што прафсаюз ніяк не абараняе іх інтарэсаў і яны не хочуць плаціць гэтай арганізацыі нават 1% ад заробку ў месяц. У выніку за прыняцце калектыўнай дамовы людзі так і не прагаласавалі.

Напрыканцы мерапрыемства выступіла старшыня сельсавета Марыя Пясляк. Яна абмалявала дэмаграфічны стан у сельсавеце і вёсках СВК "Вострава-Агра", расказвала пра працу дзіцячых садкоў, школ і бібліятэк. Марыя Аляксандраўна зазначыла, што колькасць людзей у вёсках Міжэвіцкага сельсавета за апошнія гады скарачаецца. Так, на 1-га студзеня гэтага года на тэрыторыі сельсавета пражывалі 1 416 чалавек. У вёсках СВК "Вострава-Агра" жыве 544 чалавекі. З іх 96 — дзеці да 15 гадоў, 203 — пенсіянеры і 245 працаздольных. Старшыня сельсавета зазначыла, што ў вёсках сельгаскааператыва "Вострава-Агра"становіцца не толькі менш людзей, але і кароў у прыватным статку. На пачатак года іх засталося 82, а ў мінулым годзе было 97 галоў. Так, у вёсцы Новая Перавалока ніводзін гаспадар ужо не трымае каровы і толькі адна рагуля засталася ў вёсцы Засімавічы. Адпаведна насельніцтва менш здае дзяржаве малака, хаця малаказборшчыкі працуюць спраўна.

Пасля выступлення старшыні сельсавета з залы задалі пытанне наконт падвозу дзяцей з Вострава ў Міжэвіцкую сярэднюю школу. З чацвёртага па выпускны клас там вучыцца цяпер 31 чалавек. Рэйсавы аўтобус ходзіць толькі ў суботу, нядзелю і сераду. У працоўныя дні вучняў падвозіць калгасны аўтобус, за што бацькі даплачваюць грошы на бензін. Але ў тым аўтобусе дзецям проста не хапае месца. Тым больш што, акрамя вучняў, знаходзяцца і іншыя пасажыры, якім трэба па справах у Міжэвічы. Старшыня райвыканкама паабяцаў, што гэта пытанне ён паспрабуе вырашыць.

Скончыўся сход уручэннем каштоўнага падарунка галоўнаму эканамісту гаспадаркі Соф'і Лявонік, якая ў 2003 годзе дасягнула пенсійнага ўзросту. ▪

••• ИНФОРМАЦИЯ •••

СЛОНИМСКИЙ РЫНОК
ЦЕНЫ НА ПРОДУКТЫ
ПО СОСТОЯНИЮ
НА 10.02.2004 ГОДА

Наименование	Цена за 1 кг
Молоко (1 л)	600 руб.
Творог	3 000 руб.
Масло	7 000 руб.
Яйца (1 дес.)	1 150 - 1 450 руб.
Картофель	3 000 руб. за ведро
Капуста квашеная	700 - 1000 руб.
Морковь	400 - 500 руб.
Лук	900 - 1 200 руб.
Свёкла	350 руб.
Чеснок	150 - 250 руб. за головку
Помидоры	–
Огурцы	–
Яблоки	930 - 2 800 руб.
Апельсины	2 200 - 3 500 руб.
Мандарины	3 000 - 3 200 руб.
Лимоны	2 500 - 3 300 руб.
Киви	550 руб. шт.
Гранаты	–
Бананы	2 000 руб.
Свинина	4 500 руб. бочок
Говядина	–
Телятина	–
Сало свежее	3 900 руб.
солёное	4 200 руб.
Селёдка	3 200 руб.
Макаронные изделия	1 150 - 1 200 руб.
Гречка	1 200 - 1 500 руб.
Рис	1 100 руб.
Мука	1 800 руб.
Сахар	не продаётся
Постное масло (1 л)	1 900 - 2 300 руб.
Мёд	12 000 руб.

ДАТА

ПАКІДАЎ АФГАНІСТАН АДНЫМ З АПОШНІХ

▪ Мікола КАНАНОВІЧ

15 лютага спаўняецца 15 гадоў з дня вываду савецкіх войскаў з Афганістана. Менавіта гэты дзень многія воіны-інтэрнацыяналісты лічаць днём заканчэння афганскай вайны.

Наш зямляк, афіцэр запасу Мікалай Яшкоў, 15 лютага 1989 года ў ліку апошніх воінаў-інтэрнацыяналістаў пакідаў афганскую зямлю.

У 1979 годзе Мікалай Яшкоў скончыў слонімскую СШ №1. Потым адслужыў тэрміновую службу ў войску. Па словах Мікалая Сяргеевіча, у юнацтве ён быў рамантыкам, таму пасля войска паступіў на юрыдычны факультэт Гродзенскага дзяржуніверсітэта, каб стаць сышчыкам накшталт Шэрлака Холмса. Аднак, пасля таго як Мікалай Яшкоў скончыў вучобу, яго зноў прызвалі ў армію. Спачатку накіравалі ў ваенную пракуратуру, але там не было вольнай пасады. Таму служыць давялося ва ўзброеных сілах. І ўжо праз месяц пасля атрымання дыплома Мікалай Яшкоў быў у складзе савецкага



▪ Вывад савецкіх войскаў з Афганістана. Мікалай Яшкоў на брані БМП-2, 15 лютага 1989 года

ваеннага кантынгенту ў Афганістане. Служыў у Галоўным разведупраўленні Узброеных Сіл.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 28 снежня 1988 года за мужнасць і вайсковую доблесць пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане Мікалая Яшкова ўзнагародзілі Граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за подпісам Міхаіла Гарбачова.

У абавязкі маладога афіцэра на той час уваходзіла арганізацыя вываду войскаў з чужой краіны. Афганская вайна для слонімца Мікалая Яшкова цягнулася прыкладна паўгода. 15 лютага 1989 года з апошняй калонай бранятэхнікі ён пакінуў Афганістан.

Пасля заканчэння той вайны Мікалай Яшкоў праслужыў у войску да 1992 года. Потым, як і многія звольненыя ў запас вайскоўцы, вымушаны быў шукаць сваё месца ў цывільным жыцці.

Цяпер Мікалай Яшкоў жыве ў Мінску, але і ў Слоніме бывае часта. У рэдакцыю "ГС" напярэдадні 15 лютага ён прынёс фотаздымкі пятнаццацігадовай даўнасці. Мікалай Сяргеевіч казаў, што той апошні дзень вываду войскаў з Афганістана быў сапраўдным святам, святам са слязамі на вачах.

А сёння дзень 15 лютага – гэта дзень памяці пра заканчэнне вайны, у якой не было пераможцаў і пераможаных і якая забрала тысячы маладых жыццяў людзей розных нацыянальнасцей і веравызнання.

На Слонімшчыне цяпер жывуць 276 былых воінаў-афганцаў. Раней іх было больш за тры сотні. Хтосьці, як Мікалай Яшкоў, з'ехаў на жыхарства ў іншыя месцы, а нехта ўжо адышоў у іншы свет. Сама афганская вайна стала гісторыяй не існуючай ужо краіны. Межамі сваіх краін падзелены ветэраны той вайны. Толькі памяць у іх засталася агульнай. ▪

НАВІНЫ

НАЙЛЕПШЫЯ Ў ВОБЛАСЦІ

Падведзены вынікі аператыўна-службовай дзейнасці Гродзенскага абласнога Упраўлення ўнутраных спраў за 2003 год.

Найлепшым супрацоўнікам ДАІ на Гродзеншчыне прызнаны начальнік Слонімскага аддзялення МРЭА ДАІ маёр міліцыі Уладзімір Віктараў.

Аддзяленне ДАІ Ваўкавыскага РАУС па выніках работы за мінулы год прызнана ў Гродзенскай вобласці найлепшым. Яго ўзначальвае наш зямляк з Міжэвіч Вячаслаў Шлёмін. Вячаслаў Аляксеевіч у Ваўкавыскім РАУС працуе з 1996 года.

ШЫЛЬДЫ АД ІВАНА МІСКО

Наш зямляк — скульптар Іван Міско, які жыве ў Мінску, завяршыў працы над мемарыяльнай шыльдай, прысвечанай народнаму артысту Беларусі — спеваку Віктару Вуячычу.

Шыльду ўсталююць летам на адным з дамоў беларускай сталіцы, дзе жыў вядомы артыст.

Дарэчы, некалькі гадоў таму Іван Міско зрабіў шыльду і ўсталяваў яе на школе, у якой вучыўся Віктар Вуячыч у Краснадарскім краі.

Сяргей ЧЫГРЫН

МНЕНИЕ

ОДИН ВЕЧЕР В РЕСТОРАНЕ

▪ Ольга ШИНКЕВИЧ

Недавно мои подруги решили устроить девичник. Да и повод имелся — день рождения одной из них.

Сидеть дома никто не захотел, поэтому решили пойти в ресторан. Мол, готовить еду самим не надо и поболтать можно обо всем и сколько захочешь (мужья не помешают), да и вообще – мы уже сто лет нигде не были!

Долго выбирали место, где можно было бы хорошо отдохнуть... Сразу скажу, что дело это непростое, так как, да простят меня владельцы слонимских ресторанов, ничего приличного в нашем городе нет. В любом случае мы готовы были к пропахшей кухней и сигаретным дымом одежде...

В конце концов решили пойти в ресторан "С". Настроение было отличное – все-таки день рождения идем праздновать!

В полдесятого вечера в пятницу мы уже заходили в намеченный ресторан. Надо отметить, что народу было достаточно много. Почти все столики были заняты.

ТАК МНОГО ЖЕНЩИН...

Сразу бросилось в глаза то, что в ресторане было очень много представительниц женского пола. Во всяком случае женщин было больше, чем мужчин.

Мы прошли за свободный столик. За нами пристально следила явно не одна пара глаз. Мужчины – оценивали, женщины – высматривали в нас соперниц на сегодняшний вечер. Сразу стало как-то неуютно от такого внимания.

"Просто обычно в этот ресторан приходят, чтобы кого-нибудь "снять", – сказала одна моя подруга, – вот видишь, за соседним столиком сидят две девушки. Я их знаю. Они ходят сюда почти каждую пятницу, чтобы познакомиться с какими-нибудь мужчинами. Это длится уже не один год. Может быть, до сих пор они не нашли себе подходящих кандидатур?"

Рядом с нами, за соседним столиком, сидели двое молодых и уже нетрезвых людей. Один из них повернулся, прищурил глаза (так делают близорукие люди, которые не носят очки), потом немного растянул (так скажем, навел зрение) уголок глаза и начал всматриваться в зал. Потом с трудом поднялся со стула и... пошел приглашать на танец высмотренную жертву. Девушка согласилась, хотя и скривила недовольную гримасу. Видимо, ее не устраивал внешний вид молодого человека.

ОХ, УЖ ЭТОТ "ЖИВОЙ" ЗВУК

В ресторане "С", оказывается, поют... Да еще как! Нам с подругами приходилось просто перекрикивать музыку, чтобы слышать, о чем говорит каждая из нас. А музыкант с каждым разом все больше усердствовал. Я бы сказала, он не пел, а кричал песни.

Это же ресторан, а не дискотека! Хорошо все-таки, что иногда музыкант уставал и куда-то уходил, поэтому дальше народ развлекался под магнитофонные записи. Именно в этих перерывах мы старались наговорить побольше хороших слов нашей имениннице. А потом опять приходил музыкант... и ничего не было слышно.

ПРО ОБСЛУЖИВАНИЕ

Официантки, принимающие заказ и смотрящие куда-то вдаль, вывели меня из состояния равновесия окончательно. С отсутствующим видом нас сразу предупредили, что из всех салатов в меню осталось всего лишь три вида. И, томно закатив глаза, мол, "как вы мне дороги", нам все-таки объяснили, что представляют собой эти салаты.

Мы заняли у официантки примерно четыре минуты ее драгоценного времени. А она уходила от нас с таким видом, как будто мы несколько часов "доставали" ее вопросами.

Потом нам принесли заказ – и сразу же счет. "Девочки, если вы больше ничего не будете заказывать, пожалуйста, расплатитесь", – сказала официантка. По-моему, во всех ресторанах счет просят посетители, когда уже собираются уходить. А тут...

Мы заплатили сразу. А потом моя подруга захотела еще стакан сока. Официантка невозмутимо сказала: "Сходите в соседний зал, там есть бар. Купите стакан сока там". Представляю, как это – со стаканом сока моя подруга бы шла через весь ресторан к "своему" столику.

КОНТИНГЕНТ

Как я уже говорила, женщин в ресторане "С" было большинство. Ну а присутствующее меньшинство, то есть мужчины, выглядели уж очень жалко: пьяные, шатающиеся от одного столика к другому...

Были даже экземпляры в спортивных костюмах. Видимо, просто шли мимо после тренировки и решили зайти в ресторан.

Настроение от увиденного было окончательно испорчено. "Не нравится – не ходи!" – скажете вы. Да уж больше не пойду.

И по-моему, многие рестораны нашего города нужно называть столовыми. И безо всяких там красивых и символичных названий. Просто: столовая №№2, 3, 4 и т. д. Большего они, к сожалению, не заслуживают. ▪

"01" СООБЩАЕТ

ЕСТЬ ШАНС НА СПАСЕНИЕ

На прошлой неделе по ул. Лесной, 6 произошел пожар в дачном доме жителя Слонима Дмитрия Баловнева. В результате огнем был поврежден дом.

Как позже выяснилось, причиной возгорания послужило нарушение правил пожарной безопасности при эксплуатации печного отопления.

Пожар обнаружил сосед Александр Шашлов, который, не растерявшись, начал тушить подручными средствами до прибытия подразделений МЧС. Это не дало огню распространиться и нанести значительный материальный ущерб.

А вообще-то на данный момент есть возможность вовремя обнаружить пожар, сохранить свою жизнь и имущество, если установить в доме автономный пожарный извещатель.

Его принцип работы основан на периодическом контроле оптической плотности окружающей среды и сравнении ее с пороговым значением, то есть при появлении в воздухе задымления небольшой плотности в течение 10 секунд происходит срабатывание извещателя. В результате чего раздается высокочастотный звуковой сигнал, способный разбудить спящего. Сигнал не прекращается, пока в воздухе есть дым.

Автономные пожарные извещатели можно приобрести, позвонив по тел. 2-11-71.

Алексей ТИХОНЧУК, Юрий БУЛЫКА, инспектора ИГПН Слонимского РОЧС

КРИМИНАЛ



▪ Похулиганил — в машину, пожалуйста

ГРОДНЕНСКАЯ МИЛИЦИЯ БЕЗ РАБОТЫ НЕ ОСТАНЕТСЯ

На прошлой неделе начальник Гродненского УВД генерал-майор А. Белошевский провел пресс-конференцию, на которой рассказал о криминогенной обстановке в области по итогам 2003 года.

В частности, было отмечено, что количество преступлений в области по сравнению с 2002 годом увеличилось на 1 533 и достигло цифры 13 301. Этот рост связан, скорее всего, с тем, что в прошедшем году милиция стала чаще заводить уголовные дела за мелкие кражи. В структуре уголовной преступности такие имущественные преступления занимают около 60 процентов.

Тем не менее уровень преступности на Гродненщине остается самым низким в республике, а процент раскрываемости — самым высоким. Он составил 63,1%, а по тяжким и особо тяжким преступлениям — 75,3%. Из 37 изнасилований, совершенных в 2003 году, сообщил А. Белошевский, остались нераскрытыми только 2, из 58 умышленных убийств — всего 4. И еще раскрыты 292 преступления прошлых лет.

Интересен социологический портрет преступников. В прошлом году было выявлено 6 874 лица, совершивших преступления. 49,3% — граждане старше 30 лет, 40,7% — от 18 до 29 лет, 10% — несовершеннолетние. 877 из установленных преступников — женщины.

Почти половина из вовлеченных в преступную деятельность людей — это лица, не имеющие постоянного законного источника доходов и неучащаяся молодежь.

Три четверти преступников — люди со средним и неполным средним образованием.

"ГП"

НОВОСТИ

ТУРФИРМЫ "ОТЛУЧЕНЫ" ОТ ВАЛЮТЫ

ГРОДНО. Ни одна гродненская туристическая фирма не получила от Национального банка лицензии на право работы с иностранной валютой. Исключение — филиалы крупнейших минских туроператоров.

Хождение доллара и евро, как и другой иностранной валюты, в туристических фирмах Гродно запрещено. Их руководители не хотят платить за лицензию около 2 млн. рублей, а также сдавать экзамены по внешнеэкономической деятельности. Областное управление Нацбанка признает только эти условия. Объяснение одно — все валютные операции находятся под особым контролем государства.

С фирмами, не имеющими лицензии, уже отказалось сотрудничать консульство Польши в Гродно. Таких туроператоров в городе около 40. И пока все желающие отправиться за рубеж, в частности в соседнюю Польшу, должны получать визу самостоятельно.

Заместитель начальника главного управления Нацбанка по Гродненской области Александр Прищиц в интервью ОНТ рассказал, что допуск на рынок таких турфирм должен быть регламентирован для того, чтобы не был нанесен ущерб здоровью граждан во время отдыха.

"БДГ"

ПРЭСА

ЗЭЛЬВЕНСКІ "БЭЗ"

Выйшаў з друку другі нумар зэльвенскага аніматарскага часопіса "Бэз", які рэдагуе Юры Качук.



Часопіс вельмі цікавы, змяшчае разнастайныя па тэматыцы матэрыялы. Ён адкрываецца малітваю за беларускі народ.

Родам з Зэльвеншчыны былі такія людзі, як Васіль Захарка і Сяргей Сідор. Палітык Васіль Захарка ў свой час узначальваў Беларускую Народную Рэспубліку, а доктар педагагічных навук Сяргей Сідор быў географам, даследаваў геаграфію Беларусі, пісаў і выдаваў кнігі і падручнікі. Слынным землякам прысвечаны артыкулы ў часопісе, публікуюцца цікавыя здымкі.

Пётр Марціноўскі ў "Бэзе" знаёміць чытачоў з творчымі біяграфіямі зэльвенскіх паэтак Дануты Дабрынінай і Алены Таболіч. Друкуюцца таксама іх вершы, прысвечаныя роднай Бацькаўшчыне. З паэтычнымі радкамі ў часопісе выступаюць Юрка Голуб, Алег Януль, Юля Качук і Генадзь Коўш.

Навуковымі і сур'ёзнымі разважаннямі можна назваць артыкул Юлі Качук "Ab initio", дзе аўтарка піша пра тое, калі пасяліліся першыя людзі на Зэльвеншчыне, як выглядала архітэктура тых часоў і г. д. Аказваецца, першае засяленне даліны Зяльвянкі адбылося ў эпоху мезаліту (8—5 тыс. гадоў да нараджэння Хрыста). Матэрыялы мезалітычнай эпохі на тэрыторыі Зэльвенскага раёна знайшоў археолаг А. М. Гутоўскі на стаянцы каля вёскі Цыганоўка. Падобныя стаянкі каменнага і бронзавага веку вядомыя таксама каля вёсак Кашалі і Навасёлкі.

Юры Качук у сваім даследчым матэрыяле "Карты і лёс Зэльвеншчыны" зрабіў грунтоўны аналіз гістарычнага развіцця Зэльвеншчыны, найперш яе тэрыторыі і людзей. Артыкул вельмі цікава чытаецца, у ім прыведзена шмат унікальных лічбаў і фактаў з гісторыі зямлі зэльвенскай.

Не менш цікавым атрымалася часопіснае выступленне настаўніцы СШ №3 Зэльвы Ліліі Сідоркі, якая напісала пра народную адукацыю на Зэльвеншчыне ў другой палове XIX—пачатку XX стагоддзяў.

Сяргей ЧЫГРЫН

КРИМИНАЛ

РЕШИЛ ПОХУЛИГАНИТЬ

В Гродно возбуждено уголовное дело в отношении жителя Гродненской области, который обратился в милицию с ложным сообщением о захвате заложника.

Сообщение поступило в милицию 3 февраля. Звонивший по телефону "02" неизвестный сообщил, что он, угрожая ножом, удерживает 48-летнего хозяина квартиры, расположенной на улице Поповича в Гродно.

На место происшествия сразу же направились следственно-оперативные группы УВД, Октябрьского РОВД, а также сотрудники Управления КГБ, отдела охраны и ОМОНа. На территории района был введен план "Сирена".

После переговоров с представителями правоохранительных органов "захватчик" открыл дверь и был задержан. Выяснилось, что 36-летний житель Гродненской области, позвонивший в милицию после совместного распития спиртного с хозяином квартиры, решил таким образом похулиганить.

В отношении его возбуждено уголовное дело по статье 339 "Хулиганство".

БелаПАН

НОВОСТИ

КОММУНАЛЬНИКИ ВЗЯЛИСЬ ЗА ДОРОГИ

МОСТЫ. Участок дороги в Мостах по улице К. Цеткин начали ремонтировать по той причине, что он стал непригоден для эксплуатации автомобилями.

На данный момент часть улицы перекрыли и, по информации ЖКХ, участок засыплют щебёнкой, так как дорожное полотно нуждается в капитальном ремонте.

Сливные сооружения также пришли в негодность и требуют полной замены. В связи с этим установлены объездные знаки. С улицы Советской объехать можно по улице Станционной и по улице Ленина.

ЗАДЕРЖАЛИ ЗА ТРАВКУ

МОСТЫ. Недавно в Мостах местными правоохранительными органами был задержан 24-летний житель райцентра.

Причиной тому стал наркотик — 1кг 350г марихуаны. Теперь мужчину ждёт суд. Задержанный отпущен под подписку о невыезде, т. к. ранее к административной ответственности не привлекался.

ВЕЧЕР ДЛЯ ВЛЮБЛЁННЫХ

МОСТЫ. День святого Валентина пройдёт 13 февраля в Мостовском РДК. В праздничной программе — концерт и застолье с вином, фруктами и сладостями. Вечер продлится с 18.00 до 1.00. Цена билета — 10 тысяч рублей.

ДЕНЬ СЕЛЬСКОГО СОВЕТА В РОГОЗНИЦЕ

МОСТЫ. Мероприятие, посвящённое Дню сельского Совета, пройдёт в деревне Рогозница 20 февраля.

Главная тема программы — подведение итогов за прошлый год. После этого состоится концерт народного ансамбля «Ярица» из Мостов. Кроме того, присутствующие смогут увидеть сценки и миниатюры Мостовского народного театра РДК.

И КРАСНОМУ КРЕСТУ НУЖНА ПОМОЩЬ

МОСТЫ. В ближайшее время в Мостах планируется открытие процедурного кабинета Общества Красного Креста. В связи с этим начался сбор средств на ремонт помещения. Работники кабинета окажут медицинские услуги населению на месте. К примеру, если врач прописал курс уколов, а человеку ходить в поликлинику на процедуры далеко, можно будет приходить кабинет Красного Креста. Здесь также можно будет измерить давление и температуру.

«Мы будем рады, если откликнутся люди, имеющие возможность оказать материальную помощь для строительства кабинета», — говорит Валентина Петровна, председатель Мостовского общества Красного Креста.

Ирина ЛОЙКО

ЛЮДЗЕЙ ГРЭЕ ГАЗ

МАСТЫ. Кіраўніцтва раённага прадпрыемства збыту паліва плануе сёлета змяншэнне продажу самага папулярнага віду паліва — торфабрыкету — на 80 тон.

У мінулым годзе яго прадалі 4 430 тон. Прычынаю таму з'яўляецца газіфікацыя, змяншэнне вясковага насельніцтва, а таксама змяншэнне бюджэтных датацый на паліва. Адсутнасць датацый на вугаль дазволіла гэтай арганізацыі прадаць яго за мінулы год толькі 21-у тону.

ЖАНОЧАЕ БЕСПРАЦОЎЕ ПЕРАБОЛЬШВАЕ

МАСТЫ. З 430-і афіцыйна зарэгістраваных у Мастоўскім раёне беспрацоўных 265 — жанчыны.

Кожны чацвёрты з беспрацоўных мае ўзрост да 19 гадоў, а 182 беспрацоўныя маюць агульную сярэднюю адукацыю і 172 з іх — жанчыны.

ПЕРАСТАЛІ ЖАНІЦЦА

МАСТЫ. За першы месяц гэтага года ў Мастоўскім аддзеле ЗАГС не зарэгістравалі ніводнага шлюбу. Мусіць, студзень напалохаў маладых людзей сваімі снежнымі завірухамі.


Язэп ПАЛУБЯТКА

ВЕРНУТЬ ДОВЕРИЕ БОЛЬНЫХ

МОГУТ ТОЛЬКО НАСТОЯЩИЕ СПЕЦИАЛИСТЫ, СЧИТАЕТ ОПАЛЬНЫЙ ПРОФЕССОР ИЗ ГРОДНО НИКОЛАЙ БУРНЕЙКО

Светлана КУХАРЕВА, БДГ

Сегодня на вопросы отвечает гродненский хирург Николай Бурнейко.



Фота photo.bymedia.net

Не только лекарства нужны больным, но и чуткость врача

— Николай Иванович, вы уже много лет ведете борьбу не только за собственную реабилитацию, но и за больных. Борьбу вы начали еще при Советском Союзе. Может быть, теперь проблема некомпетентности врачей неактуальна?

— Я могу привести десятки примеров злоупотреблений при диагностике, лечении и профилактике онкологических заболеваний за последние 20 лет. И уверен, что причины — в халатно-преступном отношении к больным на самом высоком уровне, в системе круговой обороны, включающей зеленый свет для произвола как в клиническом, так и в экспериментальном отношении. Приносится в жертву доверие больных, сокращается их жизнь из-за применения заведомо неэффективных средств при лечении рака. Свои соображения я изложил в официальном обращении к президенту Национальной академии наук Михаилу Мясниковичу. Я утверждал, что продолжаются злоупотребления в онкологии. В настоящее время уже имеется «Заключение комиссии НАН Республики Беларусь». Почитайте. Это поистине страна ужасов, где процветает антинаучная, корыстная и незаконная деятельность чиновников от медицины, которые ради обогащения и получения званий шли на авантюры и одурачивание высших руководящих кадров. Этот документ является лучшим ответом на ваш вопрос и страшным обвинением тех, кто занимался очковтирательством, цена которого — здоровье и жизни сотен больных.

— Можете ли вы привести примеры неоправданных смертей?

— Лучшим примером состояния квалифицированной хирургической помощи населению сегодня является показатель послеоперационной смертности, особенно при острых хирургических заболеваниях. Например, при самом частом из них — остром аппендиците — показатель оказался самым высоким в этом году. И не потому, что это заболевание сложно, а потому, что допускаются элементарные нарушения тактики при обследовании и лечении. То есть показатель высок из-за низкой квалификации хирургов, которую они получают в институтах у своих профессоров. Те в свою очередь зачастую избегают участия в трудных случаях и стараются оправдать своих подчиненных и виновных в летальных исходах, а иногда просто стараются скрыть и даже уничтожить истории болезни как вещественные доказательства. Такая тактика приносит много вреда и грозит в дальнейшем катастрофой. Для исправления положения необходимы радикальные административные меры по объективной оценке квалификации хирургов с соответствующей оплатой труда.

Примером падения уровня квалификации и ответственности за жизнь больного может служить недавний случай смерти в Гродно от острого аппендицита больного 62 лет, который обратился сразу в Больницу скорой помощи. Оттуда его направили сначала в инфекционную больницу, затем перевели обратно, потом, после дополнительного обследования, больной был переведен в онкологию с подозрением на опухоль толстого кишечника. В онкологии не смогли отвергнуть подозрение на опухоль, а потому пошли на срединную лапаротомию (вскрытие брюшной полости для ревизии), но встретили и вскрыли огромный забрюшинный гнойник аппендикулярного происхождения. Не зная тактики, пошли на удаление половины толстой кишки как при опухоли, что было грубейшей ошибкой и послужило не последней причиной смерти больного.

Об уровне оказания хирургической помощи больным может говорить и недавний случай с колотым ранением грудной клетки в области сердца больного 24 лет, поступившего в больницу спустя 12 минут после ранения. Его вполне можно было бы спасти, но без должного обследования и квалифицированной медицинской помощи парень погиб от сильнейшего кровотечения и шока, оставаясь без присмотра последние часы своей жизни.

То есть сегодня нельзя говорить о существовании у нас квалифицированных хирургических кадров и о соответствующей необходимой помощи пострадавшим даже в самых обычных случаях, когда жизнь больных может зависеть только от хирурга.

— Верите ли вы в судьбу? Почему все-таки одни больные излечиваются от рака, а другие умирают от обычной простуды или того же аппендицита?

